11.03.2012

## Сустрэчу з героямі кнігі

Новая кніга РЫУ “Літаратура і Мастацтва” ”Постаці: З цэлым народам гутарку весці…“ Зіновія Прыгодзіча ўключае ў сябе дзесяць творчых партрэтаў знакамітых дзеячаў беларускай культуры. Яны прадстаўляюць практычна ўсе сферы нашай культурнай прасторы: літаратуру, тэатр, музыку, жывапіс, скульптуру. Кніга будзе цікавая і карысная для тых, хто неабыякавы да роднай культуры, творчых здабыткаў і праблем нацыянальнага мастацтва, хто цікавіцца жыццём і дзейнасцю нашых выдатных Творцаў. Чытач знойдзе ў выданні шэраг малазнаёмых фактаў з іх біяграфій, пазнаёміцца з займальнымі гісторыямі, пра якія не часта прачытаеш у друку, адкрые для сябе нямала новага і нечаканага.

Прэзентацыя выдання адбудзецца 15 сакавіка 2012 года ў 17.00 у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.